1. Алисейчик, Г.В. «Театр кукол Белоруссии». «Миры Батлейки» (Белорусский народный театр кукол). Минск. 39стр.

2. Барышаў, Г.І. «Батлейка». Мінск, 2000. 300стр.

3. Фурс Г. «Сёння нам пакажуць батлейку».

**Чарвякова Д.Ц.,** студэнтка 450М гр.

Навуковы кіраўнік – Нароўская А.М.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ФАРМІРАВАННЕ СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА АНСАМБЛЯ ГУТЭН-ЧАПСКІХ У В. СТАНЬКАВА

Адным з самых выразных помнікаў гісторыі, якія засталіся ад рода фон Гутэн-Чапскіх, з'яўляецца сядзібна-паркавы комплекс у вёсцы Станькава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Станькаўская сядзіба фарміравалася імі з нуля, як свая радавая рэзідэнцыя.

Звестак аб барочнай сядзібе Станькава гісторыя не захавала. Новая сядзіба фарміравалася на параўнальна роўнай тэрасе ручая Рапуса, якая абмяжоўвала парк з Паўднёвага боку.

Сядзіба плошчай каля 15 га ўключала каменны палац, кухонны флігель, «скарбчык», парк з воднай сістэмай, капліцу, жылы флігель, каменны амбар, уездныя брамы, гаспадарчы двор, аранжэрэю, ацепленыя цяпліцы. Штогод у канцы XIX ст. пітомнікамі прадавалася каля 4000 сажанцаў пладовых дрэў. З цяпліц на рынак у Мінск траплялі высокаякасныя ананасы. У маёнтку быў племянны завод, у якім разводзіліся каровы швіцкай, цірольскай, галандскай парод, авечкі, сабакі [1, с.33].

Палац, пабудаваны ў 1861-1862 гг. на месцы зруйнаванага старога палаца пачатку XVII ст., займаў найбольш высокую частку сядзібы з

адчыненай паўднёвай панарамай у бок поймы. Аналізуючы фото, можна сказаць, што будынак меў дастаткова складаную кампазіцыю. Цэнтральная яго частка двухпавярховая, бакавыя аб‘ёмы – аднапавярховыя. Тыльны фасад быў аздоблены рызалітам і алькежамі. Акрамя таго, мелася вялізарная мармуровая тэраса, выкладзеная з чорных і белых плітак [4, с.473]. Палац быў пабудаваны Эмерыкам Чапскім для сваёй зручнасці, а галоўнае, для размяшчэння мастацкіх калекцый. Афармленне інтэр‘ераў выканала Соф‘я Меендорф. Палац зруйнаваны ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Падземны пераход злучаў палац з суседнім кухонным флігелем, які падкрэсліваў усходнюю мяжу параднага партэра. Будынак кухоннага флігеля, пабудаванага ў 1900 г. у формах позняга класіцызму, каменны, аднапавярховы, прастакутны ў плане. Куты і цокаль рустованы. Фасады рытмічна аздаблены лучковымі вокнамі. Сцены апаясаны антаблементам і сухарыкамі.

Парадны партэр прадстаўляе сабой вялікі газон з фантанам, які перасякае сцежка. Яго афармленне вялося ў наступныя гады з выкарыстаннем экзатычных раслін. Сіметрычна палацу былі пасаджаны тры ільма голых «Comperdawn». Усходнюю кулісу склала група сасны веймутавай, заходнюю – піхты сібірскай.

Наступны план перспектывы ад палаца складаюць элементы воднай сістэмы, якія сфарміраваліся ў пойме ручая Рапуса, перагароджанага плацінай. Ручай залівае паніжаную пойму і стварае вялізны вадаём. Даўжыня возера каля аднаго кіламетра, а шырыня да 350 м, мае два вострава і адзін паўвостраў. Адзін з астравоў, які называецца востраў Радасці, уяўляе сабой выцягнутую трапецыявідную форму з абрэзанай берагавой лініяй. Працягласць вострава – каля ста метраў з поўначы на поўдзень і 75 м – з захаду на ўсход. Такая форма з‘яўляеццат вельмі рэдкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для астравоў пейзажных паркаў і прадстаўляе вялікі навуковы інтарэс. Востраў мае халмісты рэльеф. У цэнтры вострава захавалася васьмікалонная альтанка з ломаным гранёным купалам, які ўвенчаны высокім драўляным шпілем. Альтанка стаіць на высокім гранітным падмурку, мела тры лесвіцы, лаўкі і мармуровы стол у выглядзе гатычнай вазы, які размяшчаўся ў цэнтры.

Другі востраў – востраў Смутку – меньш за першы, ён выцягнуты з захаду на ўсход. Яго даўжыня складае 100 м, шырыня – каля 40 м. Рэльеф больш спакойны. У цэнтры вострава на высокім мармуровым пастаменце раней узвышалася скульптура Багародзіцы.

На выспы можна было трапіць па драўляным выгнутым мосцікам з цыліндраванага бруса дуба. Агароджы парэнчаў былі драўлянымі, яны паўтаралі форму мосцікаў і мелі крыжападобнае драўлянае запаўненне агароджы. Мосцікі былі не шырокія і абапіраліся на дубовыя сваі.

Акцэнтам паўднёвай перспектывы з'яўляецца царква, якая знаходзіцца на супрацьлеглым беразе ручая. Царква на гэтым месцы вядома яшчэ з XVIII ст., аб чым сведчыць запіс 1714 г., каменная царква была пабудавана яшчэ князем Радзівілам за доўга да ўвядзення ўніі. Пазней, на яе месцы быў пабудаваны новы ўніяцкі драўляны храм у гонар Пятра і Паўла, які існаваў да 1852 г., калі на яго месцы намаганнямі графа Эмерыка Гутэн-Чапскага было распачата будаўніцтва праваслаўнага храма. Праект царквы граф набыў у знакамітага архітэктара К. А. Тона. Будаўніцтва працягвалася 6 гадоў. На будаўнічыя працы было патрачана больш аднаго мільёна штук цэглы і каля 10000 рублёў срэбрам. Цэглу для Станькаўскай царквы выраблялі на мясцовым цагляным заводзе графа фон Гутэн-Чапскага, шляхам прэсавання высокаякаснай чырвонай гліны. Сушку і фармаванне цэглы ажыццяўлялі прама на месцы будаўніцтва. Царква была пабудавана ў 1858 г. на ўзвышшы ў руска-візантыйскім стылі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і некалькі зрушана з асноўнай кампазіцыйнай восі. Адносіцца да тыпу крыжова-купальных храмаў з шатровай званіцай і паўкруглай апсідай. Станькаўская Свята-Мікалаеўская царква з‘яўлялася не толькі выдатным узорам праваслаўнага дойлідства «тонаўскай» эпохі, але і гарманічна ўпісалася ў рамантычны і жывапісны палацава-паркавы ансамбль радавой рэзідэнцыі графаў фон Гутэн-Чапскіх [5, с. 275].

Павільён «Скарбніца» – гэта двухпавярховы невялікі будынак у выглядзе мініятурнага сярэднявечнага замка, квадратны ў плане, з кутнымі цыліндрычнымі вежамі, якія былі ўвенчаны крэмальерамі з байніцамі і мініятурнымі вежамі-сігнатуркамі з шатровым дахам. Крэмальеры апаясаны аркатурным поясам з гіркамі, а галоўны фасад завяршаў рытмічны выступаючы карніз з кранштэйнамі і цягамі. Бакавыя фасады і зваротны галоўнаму фасад былі аднолькавымі, яны грацыёзна завяршаліся высокімі шчытамі з аднапрыступкавымі шчыпцамі. Вокны «Скарбніцы» высокія і вузкія, падобныя на байніцы, прастакутныя на першым паверсе і стрэльчатыя на другім, упрыгожаны масіўнымі прафіляванымі сандрыкамі – палаценцамі з гіркамі. Вытанчанасць дэкаратыўнага афармлення будынка дапаўняецца вытанчанымі арачкамі, надваконнымі броўкамі, гіркамі, якія кантрастуюць гладкімі сценамі архітэктурных аб‘ёмаў. Уваход вызначаны развітым парталам, над якім узвышаецца лёгкі і ажурны каваны балкон з кранштэйнамі. Некалі галоўны фасад быў увенчаны радавым гербам «Леліва», які замацоўваўся на кованай агароджы даха, а сігнатуркі вянчалі флюгеры ў выглядзе радзівілаўскіх арлоў з каронамі [3, с.120].

У паўночна-заходнім куце сядзібы ў 1897 г. пабудаваны амбар з цёсанага бутавага каменю з высокім двухсхільным дахам з «залобкамі», які за стагоддзе не згубіў сваёй магутнасці. Каменем цудоўна выкладзены не толькі сцены, але і вялізарныя франтоны амбара. Прывабнасць магутнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пабудове надаюць вокны, якія, як і дзвярныя праёмы, выкананы з цэглы, атынкаваны і выбелены. У такіх жа формах выкананы пабудовы гаспадарчага двара. У будынку кароўніка аконныя і дзвярныя праёмы – арачныя. Перакрыццё ўнутранай прасторы выканана сістэмай клінчатых зводаў, якія мацуюцца на металічных блоках [2, с.78].

На мяжы XVIII – XIX стст. Быў збудаваны жылы флігель – Г-падобны ў плане будынак, у формах ложнай готыкі. Яго асноўнае выцягнутае крыло аднапавярховае, кароткае – двухпавярховае. Асаблівую выразасць тарцовым фасадам кожнага крыла надаюць чатырохступенчатыя шчыпцы. Сцены будынка раскрэпованы прафіляваным карнізам. Куты рустованы. Дзвярныя праёмы, вокны першага паверха двухпавярховага крыла вырашаны стрэльчатымі праёмамі [4, с.435].

З усходняга боку парка знаходзілася так званая Мінская брама, у выглядзе двухпралётнай стрэльчатай аркі і будынка вартаўніка, пабудаваная у сярэдзіне XIX ст. У верхняй цэнтральнай частцы аркі размяшчаўся фамільны герб. Архітэктура пабудовы адпавядае агульнаму мастацка-стылевому характару сядзібных пабудоў, уяўляя сабой перапрацоўку форм сярэднявечнай готыкі. Апоры аркады ўмацаваны гатычнымі кантарфорсамі. Фасады кубападобнай вартоўні пад двухсхільным дахам апрацаваны арачнымі нішамі.

---

1. Валахановіч, А.І. Графы фон Гутэн-Чапскія на Беларусі / А.І. Валахановіч; навук. рэд. У.К. Ракашэвіч; Беларус. навук.-даслед. ін-т дакументазнаўства і арх. спраў. – Мінск : БелНДІДАС, 2003 – 84 с.

2. Дзержинщина : прошлое и настоящее / Под ред. П.Т. Петрикова. – Мінск : Наука и техника, 1986. – 200 с.

3. Маслиев, О.И. Архитектурные памятники Станьково – реставрация и восстановление / А.И. Маслиев // Жыццё Айчыне, гонар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нікому : матэрыялы міжнар. навук. канф., прысвечанай 180-годдзю з дня нараджэння Эмерыка фон Гутэн-Чапскага, г. Мінск, 16-18 сак. 2009 г. / Нац. гіст. музей Рэсп. Беларусь ; Польскі Ін-т у Мінску. – Мінск, 2009. – С. 88-123.

4. Памяць : Дзяржын. р-н : гіст-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэд.-уклад.: А.І. Валахановіч; рэдкал.: Л.М. Драбовіч [і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2004 – 700 с.

5. Федорук, А.Т. Старинные усадьбы Минского края / А.Т. Федорук. – Минск : Полифакт–Лекция, 2000. – 416 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Четверова Ю.Н.,** студент 540 гр.
Научный руководитель – Юхновец Т.С.

## ПРОБЛЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ И ИСПОЛЬЗОВАНИЯ ФОНДА БИБЛИОТЕКИ УЧРЕЖДЕНИЯ ОБРАЗОВАНИЯ «БРЕСТСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМ. А.С. ПУШКИНА»: ПО ИТОГАМ СОЦИОЛОГИЧЕСКОГО ИССЛЕДОВАНИЯ

В настоящее время в процессе реформирования системы высшего образования, постоянных изменений в учебном процессе ВУЗов, внедрения информационных технологий чрезвычайно важно быстрое адекватное реагирование комплектования фондов библиотек ВУЗов на изменения внешней макросреды. Основными принципами работы библиотеки ВУЗов можно назвать полноту и релевантность комплектования фонда документами в соответствии с информационными потребностями и запросами основных групп пользователей [1]. Реализация этих принципов представляет собой сложную комплексную проблему. Одним из инструментов ее решения является оптимизация комплектования